◆ Саўгас **«Трэвічы»** за першы дзень падпіскі ахапіў 112 чал. і перавыканаў даданае яму заданьне. Саўгас «Трэвічы» выклікае на спаборніцтва па пасьняховай рэалізацыі пазыкі саўгасы Жлобінскага раёну і суседні калгас імя Леніна.

◆ **ЛЁЗНА.** (Белта). Нацыянальны польскі калгас «Доўгас», Стасаўскага сельсавету на-ўдарнаму рэалізуе пазыку другой пяцігодкі. Заданьне па падпісцы на 1.200 рублёў перавыканана.

◆ **КУЗЯЙСКІ** сельсавет Лагойскага раёну заданьне па падпісцы ў 19.000 рублёў перавыканаў. Падпіскай поўнасьцю ахоплены калгасьнікі і аднаасобнікі. (БЕЛТА).

◆ **МЕНСК.** У выніку шырока разгорнутага сацспаборніцтва паміж асобнымі курсамі, Менскі хэміка-тэхналягічны інстытут брадзячных працэсаў за першы дзень падпіскі ахапіў усе студэнцкія масы і выканаў заданьне на 123,9 проц. месячнага акладу стыпэндыі.

◆ Калгасьнікі калгасу **«Зьвязда»**, Дамамярыцкага сельсавету, Клімавіцкага раёну, з гонарам перавыканалі заданьне па падпісцы на пазыку імя другой пяцігодкі.

МАЗЫР (Белта). У першы тыдзень пазыка на раёну рэалізавана на 60 проц. Рабочыя прадпрыемстваў падпісваюцца ня менш як на месячны заработак. Па іх раёнаюцца калгасьнікі. Калгасы Тварычэўскага сельсавету замест 2.900 руб. заданьня рэалізавалі пазыку на 6.200 руб. Калгасы Дуданіцкага сельсавету замест 8.400 руб. выканалі свае заданьне на 8.680 рублёў. Калгасьнікі і ўдарнікі падпісваюцца на месячны даход. Зусім слаба разгортваецца падпіска на пазыку сярод аднаасобнікаў.

ПЯТРЫКОЎ. Рабочыя сплаўвучастку падпісаліся на 200 проц. месячнай зарплаты. Наперадзе ідуць рабочыя **цагельні**, якія замест 5.000 руб. падпісаліся на 5.840 рублёў. Рабочыя саўгасу «Петрыкаў» замест 4.060 руб. падпісаліся на 4.900 руб. Саўгас Дуброва замест заданьня 2.019 руб. падпісаўся на 3.140 рублёў. (Белта).

РАГАЧОЎ. (Белта). Шырока разгарнулася падпіска на вёсцы. Ударны прыклад паказвае Забалоцкі сельсавет. Калгасьнікі калгасу «Камунар» рэалізавалі падпіску на 2.000 руб. замест пляну ў 1.250 руб. Калгас «Камунар» выклікаў на сацспаборніцтва ўсе калгасы раёну. Скончыў падпіску калгас «Чырвоныя Елкі».

Па сельсавету за нашымі разрахункам рэалізавана пазыка на 1.900 рублёў. На сацыялістычнае спаборніцтва аднаасобнікі выклікалі працоўных аднаасобнікаў Набалаўскага і Мішаўскага сельсветаў. Калгас «Праўда» сустрэў пастанову ўраду аб выпуску пазыкі масавым прадпрыемствам збожжа дзяржаве. Кожны калгасьнік падпісаўся на пазыку на 60 руб.

Заўсёды першы

Па вузкіх праходах фабрычнага аддзяленьня машынпашнага цэху друкарні імя Сталіна, снуючы ўзад і ўпоперад, хутка і клапатліва раздае распараджэньні інструктар тав. **Сьляпян.** Ён, ня гледзячы на свой даволі салідны ўзрост, пасьпявае ўсюды. Не абмінуў ён і кампаніі па рэалізацыі пазыкі, стаўшы першым арганізатарам у машынным цэху. Пазыка тут была рэалізавана за адну гадзіну на 100,4 проц. Падпісаліся ўсе, як адзін. Многія з рабочых больш, чым на месячны заработак.

Сьляпян—майстар высокай кваліфікацыі. Ён мае ў мінулым 39 год работы друкара, лепшы ўдарнік на вытворчасьці, за ўдарную работу 6 раз прэміяваны, у тым ліку чатыры прэміі атрымаў за рацыяналізатарскія прапановы.

Сьляпян заўсёды быў першым. Ня толькі прыкладным быў па падпісцы, але і часта яе ініцыятарам і прапагандыстам, растлумачваў сваім рабочым неабходнасьць пазыкі для сацыялістычнага будаўніцтва, умовы яе выпуску і рэалізацыі.

Ён добра ўсьвядоміў, куды ідуць сродкі ад пазык і гэта яго высунула ў рады перадавых ударнікаў фінансавага фронту.

Першая пяцігодка тав. Сьляпяну дала надзвычай шмат.

Зусім нядаўна,—толькі тры гады таму назад Сьляпян жыў у кватэры, якая пагадвала сабой хлеў, а зараз мае сьветлую, добрую кватэру ў новым доме.

— Я думаю, што гэта ўсё ў значнай ступені дзякуючы нашым пазыкам,—гаворыць тав. Сьляпян, і робіць усё, што ад яго залежыць, каб правесьці па-ўдарнаму рэалізацыю.

Працуючы па-ўдарнаму, ён аддае ўсе свае вешы і сілы на ўзьнёсьце вытворчасьці, бо добра ведае, для чаго і каму гэта трэба.

За ўвесь час работы ў друкарні—ні аднаго прагулу, ні аднаго браку. Упартая барацьба за выкананьне прамфінпляну, за добраякасную выпрацоўку, за эканомію дэфіцытных матэрыялаў, за рацыяналізацыю, за ўзьнёсьцё кваліфікацыі—вось яго вытворчая характарыстыка.

Бесьперапынная вучоба, асваеньне новых тэхнічных працэсаў, усебаковая перадача іх кадрам маладых рабочых—штодзённыя турботы тав. Сьляпяна.

Аб неабходнасьці пазыкі ён доўга гаварыць ня любіць.

— Нам ніхто, ні адна краіна не дапаможа. А будаваць трэба і на ўсё гэта патрэбны сродкі. Мы ўсе бачым тыя новыя гарады, заводы і дамы, на будаўніцтва якіх былі ўкладзены сродкі ад нашых пазык.

— Мы павінны паказаць прыклад сусьветнаму пралетарыяту, як трэба пачатую справу даводзіць да канца. Я ўпэўнен, што кожны сумленны рабочы падпішацца на «пазыку другой пяцігодкі»,—кавчае сваю гутарку тав. Сьляпян.

Гэта думка ня толькі т. Сьляпяна, гэта думка адданых партыі і ўраду найпэрэдавых працоўных мас.

Р—к.

МАГУТНЫЯ КЛЯСАВЫЯ БАІ У ПОЛЬШЧЫ

ТРЭЦЯЯ ЎСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА У БЕЛАСТОКУ

ВАРШАВА, 21 (Белта). Ужо каля 2-х месяцаў цягнецца забастоўка БЕЛАСТОЦКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ, якія патрабуюць падпісаньня новага калдагавору на аснове ўзроўню зарплаты 1928 году. У апошнія дні забастоўка пашырылася на рад прадпрыемстваў у іншых гарадох Беластоцкага раёну.

17 мая беластоцкія рабочыя пастанавілі абвясьціць 18 мая ўсеагульную забастоўку салідарнасьці з бастуючымі тэкстыльшчыкамі. 18 мая сталі ўсе фабрыкі і заводы Беластоку. У знак салідарнасьці з тэкстыльшчыкамі Беластоку абвешчаны ўсеагульныя стачкі ў ГРОДНІ, БЕЛАВЕЖЫ і іншых гарадох Беластоцкага ваяводзтва. Рабочыя Беластоцкага раёну праводзяць ужо 3-ю ўсеагульную забастоўку салідарнасьці з тэкстыльшчыкамі Беластоку.

Зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню, як сродак ад крызісу

ВАРШАВА, 21 (Белта). На зьезьдзе гаспадарчых і грамадзкіх дзеячоў, які быў склікан урадавым блёкам, міністар МАТУШЭЎСКІ ў заключнай прамове заклікаў да большай вытрыманасьці. Магчымы новыя гаспадарчыя патрасеньні, заявіў Матушэўскі, заклікаючы згадзіцца з намінучасьцю зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню, якое, паводле яго споў, будзе доўгім і «ня скончыцца ні сёньня, ні заўтра».

СЬМЯРОТНЫ ПРЫСУД НАД ДВУМЯ РАБОЧЫМІ

ВАРШАВА, 21 (Белта). Палявы суд у Роўні прыгаварыў рабочых ДРАЙКОПЭРА і БАГУШЭВІЧА, абвінавачаных у шпіянажы, да кары сьмерцю праз павешаньне. Распараджэньнем прэзыдэнта кара сьмерцю заменена Дракопэру пажыцьцёвай катаргай. БАГУШЭВІЧ—ПАВЕШАН.

Вал. Мядзьведзеў

Сацыял-дэмакрат: Выбачайце, але мы ўсё-ж абаронім вам вайну.

Непаладкі ўнутры нацыянал-сацыялісцкай партыі

БЭРЛІН, 20 (Белта). На сходах нацыянал-сацыялісцкага актыву ў БЭРЛІНЕ міністар прапаганды ГЕБЭЛЬС УКАЗАЎ НА РАД НЕПАЛАДАК УНУТРЫ ПАРТЫІ, якія выкліканы нібыта тым, што ў партыю пасьля прыходу нацыянал-сацыялістаў да ўлады прынята вельмі многа новых членаў.

«Гэтыя новапрынятыя члены, заявіў ГЕБЭЛЬС, хочуць перашчапіць нас у радыкалізьме. ЯНЫ ПРЫХОДЗЯЦЬ З ПАРТЫЙНАЙ ПРАГРАМАЙ І З КНІГАЙ ГІТЛЕРА «МАЯ БАРАЦЬБА» І ПЫТАЮЦЦА, ЧАМУ ЯШЧЭ ТОЕ ЦІ ІНШАЕ НЕ ПРАВЕДЗЕНА Ў ЖЫЦЬЦЁ, ЧАМУ ЯШЧЭ НЕ САЦЫЯЛІЗАВАНЫ БАНКІ і г. д.» Паводле слоў Гебэльса, такіх траба «выкінуць з партыі». Гебэльс заклікаў актыў пільна правяраць, ці не зьяўляюцца тыя, якія высоўваюць радыкальныя патрабаваньні, «замаскаванымі марксыстамі».

„Нацыянал-сацыялісты рыхтуюць у Данцыгу Варфаламееву ночь"

Польскі друк аб перавыбарчым становішчы Данцыгу

ВАРШАВА, 21 (Белта). Орган нацыянал-сацыялістаў Усходняй Прусіі «ПРЭЙСЫШЭ ЦЭЙТУНГ» друкуе загад камандаваньня мясцовых штурмавых атрадаў аб баявым зборы 28-га мая ў ЭЛЬБІНГУ (па польску Эльблёнг) каля данцыгскай граніцы. Польскія газэты паведамляюць, што канцэнтрацыя некалькіх тысяч штурмавікоў каля граніцы Данцыгу самым цесным чынам зьвязана з данцыгскімі выбарамі. «РОБОТНІК» сьцьвярджае, што ўчора зноў прыбыла ў ДАНЦЫГ КАЛЯ 300 ШТУРМАВІКОЎ З БЭРЛІНУ, КЕНІГСБЭРГУ І ЭЛЬБІНГУ. «Нацыянал - сацыялісты сыстэматычна авалодваюць Данцыгам, заяўляе газэта. Мы маем падставу сьцьвярджаць, што НА ВЫПАДАК СВАЁЙ ПЕРАМОГІ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСТЫ РЫХТУЮЦЬ У ДАНЦЫГУ ВАРФАЛАМЕЕВУ НОЧ. Дакументальныя доказы такой падрыхтоўкі перададны ўжо «ўраду польскаму».

Новыя праекты пакту 4-х дзяржаў

Герынг і Мусаліні дагаварваюцца аб пляне эўрапэйскай дырэкторыі

ПАРЫЖ, 21 (Белта). «Матэн» паведамляе, што паездка Герынга ў Рым выклікана заняваю ангельскага насла ў Рыме італьянскаму ўраду, што хуткае вырашэньне пытаньня аб пакце 4-х дзяржаў дапамагло-б далейшаму палепшэньню становішча ў Эўропе і ў прыватнасьці палегчыла-б у Жэнэве згоду аб разбраеньні. Як паведамляе «Пці Парызьен», ангельскі ўрад адначасова выступіў перад германскім, французскім і італьянскім урадамі. «Эко дэ пары», паведамляючы, што Мусаліні ўручыў французскаму і ангельскаму паслам новы тэкст пакту 4-х дзяржаў, зазначае, што французскі ўрад толькі на мінулым тыдні адхіліў усе папраўкі Мусаліні да французскага контрпраекту пакту ад 10 красавіка.

«Ордр» указвае, што Францыя прымае ўдзел у перагаворах бяз высокага задаваленьня. Газэта лічыць, што ўзьняцьцё пытаньня аб пакце 4-х дзяржаў зараз яшчэ менш свачасова, чым калі небудзь раней, а для Францыі яно нават выключна небясьпечна.

* * *

ВАРШАВА, 21 (Белта). Газэты з трыбогай адзначаюць, што паездка Герынга азначае спробу ўваскрасіць пакт чатырох. Польскае агенцтва паведамляе, што ў Лёндане паездка Герынга ў Італію зьвязваецца з праектуемай нібыта сустрэчай у Жэнэве Мусаліні з Гітлерам, Даладзе і Саймонам.

* * *

БЭРЛІН, 21 (Белта). Рымскі карэспандэнт «Кельнішэ цэйтунг», на падставе вестак, атрыманых ім з дыпляматычных колаў, паведамляе, што паездка Герынга ў Італію пасьледвала па запрашэньні Мусаліні пасьля таго, як Англія зрабіла ў Парыжы і Бэрліне крокі для паскарэньня пераговараў аб пакце 4-х дзяржаў. Паводле слоў карэспандэнта, учора адбылася гутарка паміж Мусаліні і ангельскімі і французкімі паслямі.

* * *

ЛЁНДАН, 22 (Белта). Паведамленьне аб згодзе паміж італьянскім урадам, ангельскім і французкім паслямі і прускім прэм'ер-міністрам ГЕРЫНГАМ аб новай рэдакцыі пакту 4-х дзяржаў пацьвярджаецца агенцтвам «РОЙТЭР». У мясцовых палітычных колах чакаюць падпісаньня пакту 4-х дзяржаў. Ангельскі і французкі паслы ў Рыме ўхвалілі новую рэдакцыю пакту, выпрацаваную, як гавораць, Герынгам і Мусаліні. Новая рэдакцыя перадана на зацьвярджаньне ўраду. Узмоцнена падкрэсьліваецца, што згодна тэксту пакту, які цяпер разглядаецца, рэвізія мірных дагавораў магчыма толькі праз Лігу нацый. З пакту выкінута ўсё, што раней давала повад непакоіцца, што ён створыць «дырэкторыю 4-х дзяржаў». Ён падпісваецца тэрмінам на 10 год. У ім захован прынцып паступовай рэалізацыі германскага роўнапраўя ва ўзбраеньнях, але ён не зьмяшчае ніякіх дэталяў і пічбаў. У афіцыяльных лёнданскіх колах думаюць—гавораць агенцтва—што падпісаньне пакту будзе ў значнай меры залежыць ад пазыцыі НОРМАНА ДЭВІСА (галоўнага прадстаўніка амэрыканскага ўраду ў Эўропе).

* * *

БЭРЛІН, 22 (Белта). У сувязі з прабываньнем германскага віцэ-канцлера ПАПЭНА і прускага прэм'ера ГЕРЫНГА ў Рыме, абодва германскія міністры ўзнагароджаны італьянскім ордэнам св. МАЎРЫКІЯ.

Наступленьне японскіх войск на Калган і Бэйпін

Кітайцы рыхтуюцца да супраціўленьня

ТОКІЁ, 22 (Белта). Паводле японскіх вестак, пецялёка ад граніцы Чахар-Жэхэ знаходзіцца 45 тысяч кітайскіх войск пад камандаваньнем Сун-Цзянь-піна, Дуань Цзін-ціна і Фу Цзо-І, якія рыхтуюцца аказаць супраціўленьне манчжурскім войскам Ляо Гуй-дана.

Войскі Манчжоу-Го пад камандаваньнем японскіх афіцэраў прасоўваюцца па дарозе, якая вядзе з Дэлансра за Калган, з мэтаю заняцьця Калгана. Заняцьцё Калгану матывуецца тым, што «кантроль над Калганам неабходзен у мэтах забясьпечэньня спакойнасьці ахоўных граніц Манчжоў-Го».

* * *

ТОКІЁ, 22 (Белта) Як паведамляе агенцтва «Сымбун-Рэнго» з фронту, брыгада Каторы ў ноч 21 мая без супраціўленьня заняла Тунчжоу за 13 міль ад Бэйпіну. Прасоўваньне ідзе далей. Поўдзень знаходзіліся за тры мілі на паўночны Ўсход ад Бэйпіну. Чакаецца, што гэтыя часьці сёньня ўступяць у горад. У палітычных колах чакаюць, што Бэйпін будзе ўзяты 22 мая.

„Жудасная краіна"

НАРВЭСКІ ЖУРНАЛІСТ АБ ГЕРМАНІІ

СТАКГОЛЬМ, 20 (БЕЛТА). Нядаўна арыштаваны і затым выдалены нарвэскі журналіст Лярсэн расказвае ў капэнгагенскай «Палітыкен» аб уражаньнях, вынесеных ім з Германіі:

«У мяне ўвесь час было такое пачуцьцё, што большая частка германскага народа адчувае крайні страх. У Растоку я быў сьведкаю вялікага кніжнага аўтадафэ: вакол вогнішча сабралася 15-20 тысяч чалавек, але ніхто не радаваўся. Толькі кучка людзей у форменных карычневых капулях выяўляла сваё захапленьне. Немцы сталі вельмі маўклівы і вельмі цяжка завязаць з імі размову. Усе як быццам зьнямелі. На вуліцах гавораць шэптам».

Няпрыемная справа

Пратэсты супроць антыяўрэйскага законадаўства германскага ўраду ў Лізе нацый

ЖЭНЭВА, 22 (БЕЛТА). У Лігу нацый падан рад пятыцый і пратестам супроць антыяўрэйскага законадаўства германскага ўраду.

У сувязі з надыходзячым разглядам на сэсіі савету Лігі нацый гэтых пятыцый, жэнэўскі карэспандэнт «Франкфуртэр цэйтунг» паведамляе, што на сэсіі, відавочна, будзе абмяркоўвацца увесь комплекс пытаньняў аб становішчы аўрэяў у Германіі. Нямецкія прадстаўнікі ў камісіі робяць усе намаганьні, каб адцягнуць разгляданьне Лігі нацый па пытаньні аб становішчы аўрэяў у Германіі да восені.

Дацкі ўрад забараніў адбыцьцё антыфашысцкага канграсу

СТАКГОЛЬМ, 20 (Белта). Дацкі сацыял-дэмакратычны ўрад забараніў дэманстрацыі і мітынгі ў сувязі з намечаным у Капэнгагене антыфашысцкім канграсам 4-га чэрвеня і адказ немагчымым прыезд буйных дэлегацый з фашысцкіх краін. Таму арбюро пастанавіла склікаць канграс 4-га чэрвеня ў Парыжы. Сакратарыят Арбюро пераведзен з Капэнгагену ў Парыж.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

* З першага ліпеня 1931 г. да лютага 1933 г. у Бразіліі было патоплена 5 з паловаю мільёнаў мяшкоў кавы.

* За 11 месяцаў, па працягу якіх вяліся ваенныя дзеяньні паміж Балівіяй і Парагваем без фармальнага абвяшчэньня вайны, парагвайцы страцілі з тысячы забітымі і 6.000 параненымі і палоннымі, а Балівія—8.000 забітымі і 20 тысяч параненымі і ўзятымі ў палон.

* У Мангейме было арганізавана ўрачыстае спаленьне на вогнішчы кніг, аўтары якіх залічаны да марксістаў, яўрэяў і іншых праціўнікаў «нямецкага духу».

* Паводле даных «Дэйчэ альгемайне цэйтунг», у буйнейшых вугольных раёнах Германіі—Руды, Аахэне, Заходняй і Верхняй Сілезіі, Ніжняй Сілезіі і Саксоніі за красавік здабыта 7.776.106 тон вугалю супроць 9.061.834 тон у сакавіку і 8.187.492 тон у красавіку 1932 г.

* Як паведамляюць з Белграду, на буйнейшым лесапільным заводзе ў Югаславіі «Шыпад» узьнікла забастоўка супроць зьніжэньня зарплаты і звальненьня прафсаюзных упаўнаважаных. Бастуе больш тысячы рабочых. Завод занят жандармэрыяй.

Аб зарплаце рабочых і інжынэрна-тэхнічных сіл вугольнай прамысловасьці Данбасу

Пастанова СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б)

(ПРАЦЯГ)

4. Дакладны разьмер фонду прэміяваньня па рудакіраўніцтвах вызначаецца трэстам, па шахтах — рудакіраўніцтвамі.

5. Дазволіць загадчыкам шахтамі і загадчыкам вучэбнымі пры выкананьні работ па абслугоўваньні пліт, адкатці і падкатці каля ствалоў і на паверхні карыстацца меншай колькасьцю рабочых, чым устаноўлена плянам, накіроўваць атрыманую эканомію для павялічэньня асноўнага заработку рабочых, якія выконваюць работу ў данай зьмене.

6. Устанавіць аплату брыгадзіраў падземных брыгад у залежнасьці ад колькасьці рабочых, якія яднаюць брыгады ў разьмерах ад 20 да 60 руб. у месяц і апрача таго, пры перавыкананьні месячнага заданьня — 2 проц. ад агульнага заработку брыгады.

АБ ТАРЫФНАЙ СТАЎЦЫ

Існуючыя тарыфныя стаўкі захаваць на ўзроўні 1932 г., павысіўшы іх толькі для наступных прафэсій:

А) Пачасовых (повременных) рабочых:

1. Атрымоўваючых зараз падзённую стаўку ад 1 р. 60 к. да 1 р. 75 кап.

2. Лебёдчыкам падземных цягальных лебёдак замест 2 р. 60 к.—3 р. 50 к.

3. Адкатчыкам—цаг на паверхні замест 2 р. 25 к. да 3 р.

4. Плітавым паміж штрэкаў замест 2 р. 60 к. да 3 р.

5. Падкатчыкам каля ствала замест 2 р. 60 к.—3 р.

6. Рунаятчыкам каля ствала замест 3 р. —3 р. 60 к.

7. Плітавым на цэнтр. плітах замест 2 р. — 3 р. 50 к.

8. Ствалавым замест 3 р. — 3 р. 50 к.

Б) Зьдзельшчыкаў для вылічэньня здзельнай расцэнкі:

1. Машыніст-электравоз - мэханікам — замест 4 руб. 10 к. — 5 р. 75 к.

2. Машыніст-электравоз-важатым замест 4 р. 10 к.—4 р. 80 к.

3. Канагонам замест 3 руб. 50 к. — 4 р. 10 к.

4. Бутоўшчыкам і ўборшчыкам пароды замест 3 р. 50 к. — 4 р. 10 к.

5. Лесагонам на крутых пластох замест 3 р. 50 к. — 4 р. 10 к.

6. Касьцёршчыкам і рэштачнікам замест 3 р. 50 к.—4 р. 10 к.

Для шахт кансуючыхся вугалёў Сталінвугалю, Макеёвугалю, Арцёмвугалю, Кадзіеўвугалю і Луганьвугалю ўстанавіць павышаныя тарыфныя стаўкі для наступных катэгорый рабочых:

Для машыністаў урубавых машын замест 7 р. —7 р. 70 к.

Для пам. машыністаў уруб. машын замест 4 р. 80 к. —5 р. 30 к.

Для забойшчыкаў урубавых машын замест 5 р. 75 к.—6 р. 40 к.

Для канагонаў падземных замест 4 р. 10 к.—4 р. 50 к.

Для навальшчыкаў, выдзідчыкаў вугалю з раскосаў замест 4 р. 10 к.—4 р. 50 к.

Для навальшчыкаў-саначнікаў замест 4 р. 10 к.—4 р. 50 к.

Для вагоншчыкаў з пагрузкай вугалю ўручную, замест 4 р. 10 к.—4р. 50 к.

Абавязаць рудакіраўнікоў, заг. шахтамі, галоўных інжынэраў шахт і нач. вучэбнай сурова праводзіць пастанову ЦВК і СНК СССР ад 27-5—32 г. і інструкцыю Наркампрацы СССР ад 1-6—32 г. аб мэтазгодай адказнасьці работнікаў за матэр'ялы і вырабы і за маемасьць прадпрыемстваў ці ўстаноў, выданыя ў карыстаньне работнікам.

Аб павялічэньні зарплаты і прэміяваньні інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу і дзесятнікаў

Зацьвердзіць наступныя пастановы Наркамцяжпраму:

Адпаведна з пастановаю СНК і ЦК УсеКП(б) ад 8-IV—1933 г. аб рабоце вугольнай прамысловасьці Данбасу ў мэтах скансцентраваньня на шахтах лепшых інжынэрна-тэхнічных работнікаў і стварэньня стымулаў да лепшага тэхнічнага кіраўніцтва шахтай, для выкананьня і перавыкананьня пляну

1. Устанавіць з першага чэрвеня 1933 году наступныя пасадавыя аклады для інжынэраў і тэхнікаў, якія працуюць непасрэдна на шахтах:

I. 1) Галоўны інжынэр першай групы шахт замест існуючага акладу 650—850 — 900—1.100.

2) Галоўны інжынэр II-й групы замест 600—750 — 750—850.

3) Галоўны інжынэр III-й групы

II. 1) Пам. гал. інж. I-й гр. замест 450—500 — 750—900.

2) Пам. гал. інж. II-й групы замест 450—475 — 650—800.

III. 1) Электрамэханік I-й гр. шахт замест 450—500 — 600—750.

2) Электрамэханік II-й гр. шахт замест 350—400 — 500—650.

3) Электрамэханік III гр. шахт замест 325—375 — 400—500.

IV. 1) Заг. вэнт. I-й гр. шахт замест 325—450 — 550—650.

2) Заг. вэнт. II-й гр. шахт замест 300—350 — 400—500.

3) Заг. вэнт. III-й гр. шахт замест 300—325 — 350—450.

V. 1) Заг. рух. на буйн. шахт. замест 300—375 — 550—650.

VI. 1) Начвучком I гр. замест 350—400 — 600—700.

2) Начвучком II гр. замест 325—375 — 550—650.

3) Начвучком III гр. замест 325—350 — 450—550.

VII 1) Пам. начвучком I-й гр. замест 325—375 — 450—550.

2) Пам. начвучком II-й гр. замест 300—350 — 375—450.

VIII. 1) Нарміроўшчык (тэхнік) замест 300—350 — 400—550.

2) ОД (незрэзум. тэлеграфн. скарачэньне) — 175—350 — 350—450.

IX. 1) Эканамісты шахт па тар. раб.—225—325 — 350—450.

X. 1) Інжынэры (тэхнікі па кап. рабоце) I-й гр. замест 350—475 — 600 — 700.

2. Дазволіць заг. буйн. шахт для паасобных высокакваліфікаваных інжынэраў і тэхнікаў, якія пераходзяць на работу ў якасьці галоўных інжынэраў шахт, устанаўляць пэрсанальныя аклады да 1.500 рубл., з зацьверджаньня ў кожным паасобным выпадку кіраўніка трэстам.

3. Устанавіць для ІТР шахт кансуючыхся вугалёў павышаныя аклады ў параўнаньні з іншымі шахтамі на 10 проц.

4. Устанавіць наступныя аклады для дзесятнікаў, манцёраў, электраманцёраў, працуючых непасрэдна на шахтах:

I. 1) Эксплёватац. дзесят. вучаст. I-й гр. замест існуючага акл. 200—250—325—400.

2) Эксплёватац. дзесят. вучаст. II-й гр. замест існуючага акл. 175—225 — 275—350.

3) Эксплёватац. дзесят. вучаст. III-й гр. замест існуючага акл.

II. 1) Дзесятн. рух. I-й гр. замест існуючага акл. 175—200 — 275—325.

2) Дзесятн. рух. II-й гр. замест існуючага акл. 160—175 — 225—275.

3) Дзесятн. рух. III-й гр. замест існуючага акл. 160—175 — 200—250.

III. 1) Дзесятнікі па вэнтыляц. шахт I-й гр. замест 150—225 — 275—350.

2) Дзесятнікі па вэнтыляц. шахт II-й гр. замест 150—200 — 250—300.

3) Дзесятнікі па вэнтыляц. шахт

Ператварыць каапгасы ў магутную крыніцу рабочага снабжэньня!

Ліквідаваць адставаньне каапгасаў, аказаць ім шырокую сацыялістычную дапамогу—кроўны абавязак усіх заводзкіх арганізацый, усёй пралетарскай грамадзкасьці

ВЫРАШЧАНА У ПАРНІКОХ

Упакоўка гуркоў перад адпраўкай у каапэратывы (каапгас ТСТ).

ПЕРАМОГА „ЧЫРВОНАГА ТРАНСПАРТНІКА“

Каапгас Менскага ЦРК «Чырвоны транспартнік» паказаў узоры бальшавіцкай работы. Усьведамляючы значаньне своечасовага і добраякаснага скончаньня сяўбы, каапгасы рабочых каапгасу забясьпечыў датарміновае выкананьне пляну.

Яшчэ 25 красавіка— за тры дні да вызначанага тэрміну — была скончана сяўба аўса на плошчы 30 га.

Змагаючыся ня толькі за колькасныя показьнікі, але і за якасьць сяўбы, рабочыя забясьпечылі поўную норму высеву—160 клг. на га, для чаго яны загадзя правялі пробную сяўбу на адным падрыхтаваным гэктары.

Усё насеньне было раней пратручана, глеба добра апрацавана і падрыхтавана. Сьведчаць добрай работы—зялёныя ўсходы, якія ўжо зьявіліся на палёх.

Раней вызначанага тэрміну засеяна і 55 га бульбы.

Сяўба раньняй бульбы поўнасьцю скончана 30 красавіка; паводле пляну да гэтага часу трэба было засеяць толькі 50 проц.

Позьняй бульбы засеяна на 0,6 га звыш пляну, на адзін дзень раней тэрміну.

8 мая скончана сяўба ячменю. Гароху засеяна 6 га, пры пляне ў 5 га— за два дні раней тэрміну; морквы—2,2 га супроць пляну ў 2 гэктары—за пяць дзён да тэрміну.

Поўнасьцю закладзены 2.024 парніковыя рамы.

Калектыў «Чырвонага транспартніку» дапамагае і суседнім гаспадаркам. Ён выпучыў 10 лепшых рабочых, 12 коней і адзін трактар і паслаў іх на пікніцкую прарыву ў каапгасе работнікаў прыгадку.

Гісторыя каапгасу «Чырвоны транспартнік» заслугоўвае ўвагі. Да гэтага году каапгас працаваў вельмі дрэнна. Ён быў засьмечаны клясава-варожымі элементамі. Конскае паголоўе было фактычна выведзена са строю—50 проц. коней было прызнана нягодными. Інвэнтар гаспадаркі не рамонтаваўся. Сталоўка была зэпушчана і фактычна ператварылася ў хлеў.

Ударніцтва ў гаспадарцы зусім ня было разгорнута. Новае кіраўніцтва пабаявому ўзялося за ліквідацыю прарываў. Са стайкілу выгнана 5 рабочых-шкоднікаў, з якіх два кулакі—Смольскі і Грановіч. Паводле патрабаваньня рабочых вычышчан і аддан пад суд рабочы Будавей, які пакінуў на тры гадзіны ў полі коняй, якія звалілісь ад стамленьня.

Адрамантован інвэнтар. Прыведзена ў парадак сталоўка і інтэрнат. Сярод рабочых праведзена шырокая масава-растлумачальная работа. Рабочыя разьбіты на 11 брыгад. Да кожнай пры мацован пэўны вучастак і інвэнтар. Вытворчыя пляны даведзены да кожнай брыгады. З 185 рабочых, 140 замацаваліся за гаспадаркай.

Ёсьць у каапгасе рад перадавых ударнікаў, у якіх трэба вучыцца ўменьню працаваць. Брыгадзірша ТОНКІНА ў дрэнным дажджлівым надвор'е 14 мая вышла ня следзячы на сваю хваробу на работу, каб забясьпечыць выход усёй брыгады. Брыгадзір паляводчай брыгады тав. ІВАНОВІЧ—добры арганізатар, які забясьпечвае высокую якасьць палявых работ, штодзенна перавыконвае план на 20 проц. Былы батрак пана Немарчанскага ІВАНОВІЧ вядзе жорсткую барацьбу з прапульшчыкамі і подырамі. Перавыконвае нормы групавод гародняй брыгады тав. НАЎРОЦКІ.

Старшы рабочы паляводчага цэху тав. ПЕТРАШКЕВІЧ (кандыдат партыі) з малых год працаваў батраком у пана Ваньковіча, дзе прайшоў цяжкую школу жыцьця. Дырэктар саўгасу—тав. МАЛКІН—рабочы Віцебскай абутковай фабрыкі, 25-тысячнік.

Увесь кіруючы апарат каапгасу з рацыі да позьняга вечару знаходзіўся на вучастках, дапамагаючы ходу сяўбы.

Усё гэта забясьпечыла перамогу «Чырвонага транспартніка».

Брыгада «Зьвязды»: РУБІН, САЛАВЕЙЧЫК, ПЕТРАШКЕВІЧ.

РЭЗАЛЮЦЫЯМІ ПОЛЯ НЕ ЗАСЕЕШ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Каапгас швэйнай фабрыкі імя Валадарскага засеяў у гэтым годзе засеяць 16 га яравога кліну. Гаспадарка поўнасьцю забясьпечана рабочай і цягавай сілай. Ёсьць адзін трактар. Зямля каапгасу—сялішча ў раёне. Між тым гаспадарка ўвесь час адстае ў сяўбе. План на 20 мая выкананы на 30 проц.

Асабліва дрэнна ідзе сяўба бульбы: замест 70 га засеяна 26. Да гэта га часу не заворана ўся плошча.

Гаспадарка атрымала ад Вучдору ў нарадку ўласнаручнага агрэгат трактар. Старшыня рабочкому тав. Пахомаў, які паехаў атрымаць трактар і прычэпны інвэнтар, не пазьвіўся нагляднасьць, якія плугі яму даюць. Ён прыняў замест трактарнага плугу—«Сакоўскі», з якім трактар працаваць ня можа. У выніку машына тры дні стаяла без работы.

Дырэктар гаспадаркі тав. Палкін замест таго, каб кіраваць работай, займаецца бюрэйнай мітусьнёй і агульным пакаёрэтным загадам.

Распарадак рабочага дня так рэгламентаван, што для работы застаецца толькі 6 гадзін. У 9 гадзін ранцы канчаецца сьнеданьне, абед працягваецца с 12 да 3, а ў 6 гадзін увечары на полі ўжо нікога няма.

Якасьць работ вельмі дрэнная. Усё поле, дзе засеяна бульба, у агрохах. Апраном Русанаў даў такую «ўстаноўку»: «У нас зямля на высокім месцы, бульбу можна сеяць у аднавор». Які ўраджай можа быць пры такой апрацоўцы зямлі?

ЗРК швэйнай фабрыкі менш усяго цікавіцца работай каапгасу. За ўвесь час сяўбы старшыня ЗРК тав. Штам ні разу ня быў у гаспадарцы.

На фабрыцы многа гаворыць і шэпчуць аб стваронымі ўласнай харчовай базы, але канкрэтнай дапамогай і кіраўніцтвам гаспадары нічто не займаецца. Рэзалюцыямі поля не засееш.

Н.

Правільная арганізацыя працы—зарука посьпеху

Калі дырэктар, сакратар ячэйкі, старшыня рабочкому і рабочы актыў прыгарадпай гаспадаркі Полацкага ЦРК ўпаршыню загаварылі аб пляне работ, калі на белай паперы выстрай валіся лічбы, выклікаўшыя гарачыя спрэчкі прысутных, знаходзіліся людзі, якія скалілі зубы, хіхікалі: «бач ты, яшчэ зіма толькі пачалася, а яны ўжо думаюць аб падрыхтоўцы да сяўбы—адна сьмехата».

«Скалазубы» атрымалі па заслугах. Рабочыя прыгарадпага саўгасу адказалі ім бальшавіцкай справай.

Ячэйка і мясцком шырока папулярызавалі сярод рабочых тыя вялізарныя адказныя задачы, якія па іх усклаўдзены на палышпэньні рабочага снабжэньня.

Вельмі грунтоўна быў прапрацаван сярод рабочых прамфінплян гаспадаркі. Ужо ў сакавіку ён быў зацьверджан у канчатковым варыянце, быў дэталёва абгавораны і прапрацаваны ў кожным цэху, брыгадзе, і кожным паказобку рабочым календарны плян работ і апраправілы. Кожная брыгада, кожны цэх з самага пачатку добра ведалі, колькі тон гародніны і іншай прадукцыі яны павінны даць.

***

Яшчэ далёка ня ўсюды растаў сьнег на полі, а рабочыя гаспадаркі былі ўжо падрыхтаваны да палявых работ. Інвэнтар адрамантован на 100 проц., загатоўлена насеньне, гаспадарка ўкамплектавана рабочай і цягавай сілай. Коні ўсе ў парадку. Гною вывезена 9.700 тон замест 8.258.

Асабліва вялікая ўвага зьвернута на арганізацыю працы і расстаноўку сіл: усе рабочыя разьбіты на брыгады; дзьве брыгады па парніках, тры па кармашалёх, дзьве па агародах і адна —жывёлагадоўчая.

Кожная брыгада добра ведае, якія культуры за ёй замацаваны, колькі ўраджаю павінен даць гэктар, колькі прадукцыі павінна даць гаспадарка. Паводле пляну, каапгас павінен даць с-г. прадуктаў на 335.000 руб.

Ужо да канца красавіка каапгас мог рапартаваць аб поўным выкананьні пляну закладкі парніковых рам. Зараз кожны дзень гаспадарка рэалізуе, прадае рабочым каапэратывам сьвежыя гуркі, салату, радыску, цыбулю і інш.

У другой пяцідзёнцы мая шырока разгарнулася сяўба гародніх і кармавых культур. План сяўбы аўса і ячменя ўжо выкананы.

— У мінулым годзе,—заяўляюць кіраўнікі каапгасу,—мы так паставілі работу, што наша гаспадарка давала добры прыбытак. Мы маем усе магчымасьці павысіць у гэтым годзе рэнтабельнасьць каапгасу. Значна ўзьнялася прадукцыйнасьць працы: калі ў 1932 годзе на пасадку бульбы патрэбна было 6 чалавек на 1 га, дык зараз гэтую працу выконваюць 4 чал. У красавіку 1932 году адзін рабочы абслугоўваў 110-115 парніковых рам, у гэтым-жа годзе на аднаго рабочага прыпадае 130-140 рам.

У каапгасе як сярод брыгад, так і сярод брыгадзіраў разгорнута сацыяпабарніцтва і ўдарніцтва. Лепшыя прыклады ўдарнай работы паказваюць—першая камсамольская гаспадарча-разлікавая брыгада на парніках—брыгадзір **Жукава.** Гэта брыгада абслугоўвае 1300 парніковых рам і дае добрыя якасныя показьнікі. Ня гледзячы на дрэнныя ўмовы надвор'я, нормы выпрацоўкі перавыконваюцца.

На гародніх культурах адкрытага

Упакоўка рэдзіскі перад адпраўкай у каапэратывы.

грунту ўперадзе ідзе брыгада **Насатовіч Марылі.** Гэтая брыгада своечасова рэгарнула сяўбу раньняй гародніны, моркву, рассадзікаў, а таксама пасадку раньняй бульбы. Рабочыя гэтай брыгады рэгулярна перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Заданьне па сяўбе — 2 га капусты, 2 га буракоў, 0,5 га бручкі, 4 га моркву выканала па два дні раней тэрміну.

Надзвычай добрыя показальнікі догляду коняй у часе працы дае брыгада **Шалбанава.** Пры напружаным становішчы з канцэнтраванымі кормамі коні гэтай брыгады па сытасьці вышэй сярэдняга. Гэтая брыгада перавыконвае нормы выпрацоўкі на ворыве парахонным плугам. Замест 0,65 га ў дзень, выконваецца— 0,75-0,85 га. Баранаваньне замест 4 га даведзена да 5 га.

Ня лішне будзе таксама спыніцца на тых адмоўных баках, якія мае гаспадарка.

Значная частка плошчы знаходзіцца на нізкім месцы. Неабходна правесьці мэліярацыйныя мерапрыемствы. Гэта-б дала магчымасьць асвоіць яшчэ 300 га найзабалочанай плошчы і асушыць прылягаючыя палі. Адначасова гэта-б да мінімуму скарацілі пераходны перыяд да правільнага севазвароту. Для гэтай мэты неабходна затраціць 20 тыс. руб. Белкаапсаюз-жа скараціў суму да 5 тыс. руб. ды і гэтыя 5 тыс. руб. пакуль-што не пераведзены.

Выключна дрэнна пастаўлена грамадзкае харчаваньне. Пры налічэньні прадуктаў адсутнічае ўсякая распарадлівасьць у іх скарыстаньні.

Побач з ліквідацыяй вызначаных недахопаў, трэба ўзьняць тэмпы сяўбы, своечасова прыступіць да прапоўкі. Нельга забываць, што першыя прапалачныя работы супадуць з самым напружаным перыядам пасеўных і пасадачных работ на агародах.

Адсюль пытаньні расстаноўкі сіл, стымуляваньня якасьці працы, арганізацыі прапалачных работ набываюць асабліва важнае значэньне.

Брыгада «Зьвязды»— ЧАВУСКІ, ІВАНОЎ.

НА ПАЛЁХ РАСЬЦЕ ПУСТАЗЕЛЬЛЕ

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Прыгарадная гаспадарка Бабруйскага ЦРК—адна з буйнейшых гаспадарак у раёне. Яна падзяляецца на вучасткі, кожны з якіх мае спэцыяльны ўхіл. Вучастак № 1—сурочышча «Пітомнік» мае чыста гародны ўхіл. На гэтым вучастку павінна быць у мінімальны тэрмін засеяна 132 га розных гародніх культур.

Апраном КЛІМКО, а за ім і дырэктар гаспадаркі тав. МІРОНАЎ пічаць, што гародніную сяўбу трэба скончыць ня раней, чым у палове чэрвеня.

Іх меркаваньні супадаюць з дырэктывамі ўраду аб паскораных тэрмінах сяўбы.

Каля 50 проц. плошчы не засеяна.

Кіраўніцтва гаспадаркі павінна было зрабіць усё магчымае, мабілізаваць усе сілы, каб паскорыць тэмпы палавых работ. Але ўся бяда ў тым, што апраном Клімко, які непасрэдна кіруе сяўбай, ня бачыць у гэтым нічога небясьпечнага. Ён аптымістычна глядзіць на становішча і ўпэўнена заяўляе: «У бліжэйшыя дні скончым сяўбу».

Хто можа паверыць гэтай заяве, калі за апошнія 20 дзён засеяна толькі 1,5 га цыбулі, 18 га буракоў і 10 га моркву. Тэмпы, як бачыце, чарапашьі! А якасьць сяўбы? Уся цыбуля і рассада капусты пасаджаны ў аднавор, па сёлета ўзьнятай цаліне. На полі пачынае ўжо квітнець пустазельле. Калі ў бліжэйшыя дні ня будзе прыступлена да дедатковай міжрадняй апрацоўкі, дык трава заглушыць рассаду.

Зарастае пустазельлем і тое поле, якое вызначана пад пасадку 35 га капусты. Гэта поле на зіму ня было ўзарана. Не паклапаціліся яго пераараць і цэлерашняй вясной. Паміж кучамі перасохшага гною квітнеюць «анюціны вочкі», хвошч і інш. паразыты.

Невядома, калі Клімко ўздумае загадаць кіраўніку вучастку Зандэйгу ўзараць гэты вучастак зямлі. Сам Зандэйг вельмі спакойны, яму сьпешацца няма куды. Кожны тыдзень ён акуратна адпускае ў горад на выхадны дзень сваіх рабочых. 14 мая на вучастку ня было ні аднаго з рабочых, ня кажучы ўжо аб кіраўніках. Усе яны гулялі ў горадзе.

Азнаёмімся з практыкай работы другога вучастку прыгарадпай гаспадаркі—паляводчага. На гэтым вучастку ёсьць выстарчальны лік рабочай сілы. Ёсьць 23 коні, тры трактары. Адным словам — у наяўнасьці ўсе ўмовы для таго, каб паўзорнаму правесьці веснавую сяўбу. Аднак, дагэтуль на вучастку яшчэ ня скончана сяўба збожжавых яравых культур. Зусім ня прыступлена да пасадкі корань плёдаў.

Чым тлумачацца такія нізкія тэмпы работы?

Сацыяпабарніцтва ў брыгадах не разгорнута. Работа ідзе вяла, нормы сыстэматычна ня выконваюцца.

Паколькі не ліквідавана ўраўніпаўка, ня створаны матар'яльныя стымулы для ўдарнай работы.

Сама сыстэма арганізацыі працы тармозіць тэмпы сяўбы. Вось адзін з пунктаў «правіл унутранага распарадку»:

«Пералод дзе першы званок на сьнеданьне роўна а 6 гадзіне; другі званок—а 8 гадзіне».

Такім чынам дзьве гадзіны працуюць на сьнеданьне!

Вось яшчэ адзін з пунктаў правіл: «За спазьненьне без уважлівых прычын да 10 мінут налічваецца адна гадзіна прагулу, за другое спазьненьне—дзьве гадзіны, за трэцяе—пяць гадзін і г. д.».

Меры ўзьдзейнасьці прымяняюцца толькі пасьля таго, як гультай спозьніцца на работу ня менш 4 разоў.

Кіраўніцтва прыгарадпай гаспадаркай не паклапаціцца правільна расставіць рабочую сілу.

Узорам мітусьні і выключна дрэннай арганізацыі працы можа служыць дзень 14 мая. Частка брыгады зранку была на міраванна на пасадку бульбы. Да месца работы на працягу 6 гадзін падвозілі на соньне. Пасьля абеду загадчык вучастку Круцікаў перакінуў усіх рабочых на вывазку гною. Падвезеную да месца пасадкі бульбу прышлося вазіць назад у пуню. На гэтай бесплённай рабоце цэлы дзень былі заняты 3 работнікі і 2 коні.

Трактары скарыстоўваюцца няправільна. Напрыклад, трактар «ФП» магутнасьцю 10 сіл развозіць на полі гной, ён цягне калёсы, у якіх звычайна запрагаюць двух коняй. А тым трактары, што працуюць на ворыве, па некалькі разоў у дзень за 1,5 клм. прыяжджаюць на сядзібу для заправкі. У выніку нормы ня выконваюцца. Трактар «Інтар» за зьмену ўзорвае толькі 2,5 га.

Вось дзе прычыны нездавальняючых тэмпаў сяўбы ў каапгасе Бабруйскага ЦРК.

П. Ч.

ВЫРАШЧАНА У ПАРНІКОХ

Сьвежыя гуркі з парнікоў каапгасу ТСТ.

Ход сяўбы ў каапгасах БССР

(у проц. да посеўнага пляну, на 20 мая 1933 г.)

МЕНСК	ГОМЕЛЬ	БАРЫСАЎ	БАБРУЙСК
81,6	81,2	72	53,3

МАГІЛЕЎ	ВІЦЕБСК
38,1	35,9

Сяўба раньніх культур скончана

Рапарт ЦК КП(б)Б, СНК, ЦСПСБ, Менгаркому, ГСПС, Гарсавету

КААПГАС ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЙ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК», ДЗЯКУЮЧЫ МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ ГАСПАДАРКІ, СКОНЧЫЎ СЯЎБУ РАНЬНІХ КУЛЬТУР.

ЗАМЕСТ 68 ГА АЎСА ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ ЗАСЕЯНА 68,7, ЯЧМЕНЮ ЗАСЕЯНА 15 ГА ПРЫ ПЛЯНЕ У 15, БУЛЬБЫ 100,3 ГА, ЗАМЕСТ 100 ГА.

ПЕРАКЛЮЧЫЛІСЯ НА БАЛЬШАВІЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ СЯЎБЫ ГАРОДАЎ, АДНАГАДОВЫХ І ШМАТГАДОВЫХ ТРАЎ.

Трыкутнік фабрыкі: КАРАСІК, ШНЭЙДЗЭРМАН, НЕМІК.

ПРЫ АКТЫЎНАЙ ДАПАМОЗЕ РАБОЧАГА КАЛЕКТЫВУ

РЭЧЫЦА.

Камбінат «Х Кастрычнік» атрымаў прыгарадны саўгас — 1.100 га ворпай зямлі. Партколектыў камбінату адразу-ж узяўся за палышпэньне работы гаспадаркі — сваёй харчовай базы. Ён выпучыў 15 лепшых ударнікаў для кіруючай работы ў брыгадах каапгасу. Увялі севазварот, разьбілі рабочых па брыгадах, да якіх прымацавалі коняй і пэўныя вучасткі зямлі. Над брыгадамі ўзялі шэфства цэхі камбінату.

Рабочыя часта наладжвалі суботнікі для дапамогі сваёй гаспадарцы. Дзякуючы гэтым суботнікам, удалося адрамантаваць увесь інвэнтар, падрыхтаваць насеньне. Камбінат аддаў каапгасу сваю машыну для вывазкі гною.

На ўвесь час сяўбы да каапгасу прымацован прадстаўнік парткому камбінату тав. Фінкэльбэрг. Ён усю сваю энэргію аддае гаспадарцы, дапамагае брыгадам, камсамолу, разгортвае палітычна-масавую работу.

Кожная вытворчая брыгада мае свайго парторга і прафорга. Вылучаныя рабочыя фабрыкі ўкараняюць у брыгадах сацыялістычныя мэтады працы і жорсткую дысцыпліну.

Кожны недахоп, кожны факт зьніжэньня тэмпаў сяўбы зараз-жа абгаварваецца на трыкутніках брыгад, палітучых рабочых сходах камбінату.

«Адстала было брыгада Мэйера; — расказвае сакратар камсамольскай ячэйкі тав. **Коханава,** — дык мы зараз-жа абгаварылі справу на лятучым сходзе ў часе абеду вызначылі мерапрыемствы і брыгада зноў пачала перавыконваць нормы: вывезьлі гной, зааралі больш 2 га бульбы.

У выніку вялікай дапамогі рабочага калектыву да 23 красавіка каапгас перавыканаў заданьне па сяўбе аўса: замест 135 га засеяна 138, перавыкапана заданьне і па сяўбе ячменю — замест 15 га засеяна 16.

План па раньняй бульбе выканан поўнасьцю: засеяна 70 га.

Сяўба яравых культур праведзена радковай сявяркай, ачышчаным пратручаным насеньнем.

Упераадзе ўсіх брыгад каапгасу ідуць: брыгады **Новікава, Кулажанкі, Мэйера і Зубаўца.**

Каапгас камбінату «Х Кастрычнік» зьяўляецца лепшым у Рэчыцкім раёне. Іншыя гаспадаркі павінны раўняцца па ім.

ДАШКЕВІЧ.

НАМ ПАТРЭБНА ТАННАЯ ГАРОДНІНА, ТАННЫЯ КАРМЫ

Якія цэны будуць існаваць па каапгасную прадукцыю бягучага году? Колькі прыдзецца плаціць рабочаму за бульбу і гародніну ўраджаю прыгарадных гаспадарак?

Цяльга, зразумела, цяпер, калі толькі разгортваецца сяўба ў большай частцы каапгасаў БССР, воддкладна адказаць на гэтыя пытаньні. Бясспрэчна адно: **цэны на бульбу і гародніну будуць галоўным чынам, залежыць ад іх сабекошту гаспадарцы.** Тое-ж трэба сказаць і аб прадукцыі: жывёлагадоўлі. Чым нізкі будзе сабекошт аўса, ячменю і інш. відаў кармоў, тым нізкай будзе продажная цана на каапгасное малако і інш. прадукты жывёлагадоўлі.

Практыка сяўбы ў каапгасах БССР сьцьвярджае аб тым, **што барацьба за нізкі сабекошт прадукцыі гароднінства і паляводзтва не стаіць у цэнтры ўвагі прыгарадных гаспадарак.** Аб гэтым асабліва яркa гаворыць вопыт работы каапгасу «Новы сьвет», які належыць менскаму праваапрадоўчаму заводу імя Молатава.

У каапгасе «Новы сьвет» скончана сяўба аўса на плошчы 26 га. Колькі каштавала сяўба гэтых культур? Бухгальтэрыя дала даведкі аб наступных фактычных выдатках на гэктар аўса: ворыва каштуе 16 руб. 50 кап., баранаваньне — 5 р. 40 к., насеньне (194 кгр.) — 25 р. 30 кап., сяўба — 6 р. 23 к., фасфарытнае ўгнаеньне — 18 р. 40 кап., падвозка мінэральных угнаеньняў — 3 р. 94 кап., ці адпавядаюць гэтыя фактычныя выдаткі плянавай калькуляцыі каапгасу? На гэта пытаньне цяжка адказаць па тэй простай прычыне, што ні адзін з работнікаў гаспадаркі ня ведае і нават ня бачыў калькуляцыі. Яе складаў плянавы сэктар заводу, які даў гаспадарцы толькі адну лічбу — плянавы сабекошт кілёграма аўса.

Якімі шляхамі трэба дабівацца захаваньня плянавага сабекошту, якія нарматывы паасобных выдаткаў па тай ці іншай рабоце ўстаноўлены плянам — гэтага каапгас ня ведае.

У сувязі з адсутнасьцю плянавых памятніканў у каапгасе, зьвернемся да арыентовачнай калькуляцыі с.-г. кіраўніцтва Белкаапсаюзу. На нарматывах с.-г. кіраўніцтва пасеў гэктара аўса павінен абыйсьціся ў **53 р. 85 кап.:** ворыва 9 р. 65 к., баранаваньне — 3 р. 50 к., насеньне — 12 р., сяўба — 4 руб., угнаеньне 5 р. і г. д.

Такім чынам, **фактычныя выдаткі па сяўбе аўса перавысілі арыентовачныя нормы сельгаскіраўніцтва амаль у два разы.** Ня вытрымліваюць пікай крытыкі спробы каапгасу апраўдаць высокі сабекошт адсутнасьцю падрабязнай плянавай калькуляцыі і пікіцыцёвасьцю нарматываў. Гаспадарка добра ведала, што плянавы сабекошт кілёграма аўса, устаноўлены заводам для каапгасу, перавышае арыентовачныя нарматывы толькі на 1 капейку — 16 кап. замест 15. Значыць, усе элементы распрацаванай заводам калькуляцыі вельмі нізначна разьходзяцца з памятніканамі с.-г. кіраўніцтва Белкаапсаюзу. Яны гатовы наваг згадзіцца з тым, што сяўба аўса, як і раньняй бульбы, каштавала даражэй, чым належыла. Аднак, яны ўпэўнена глядзяць на будучыню:

— Нічога, у нас справа наладжваецца. З'эканомім на далейшых затратах. У плянавы сабекошт мы не ўкладземся, аднак, думаем ўсё-ж зьнізіць сабекошт.

Гэтыя запэўненьні—нічым няўгрунтаваны аптымізм. Наадварот, факты таварыць, што показальнікі сабекошту будуць вельмі высокімі. Вось гэтыя факты. У той час, як перадавы менскія каапгасы скончылі сяўбу, «Новы сьвет» зацягвае палявыя работы.

Нікай увагі не адпаецца якасьці палявых работ. Ніхто ня сочыць за выкананьнем мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць высокую ўраджайнасьць. Выявілася, што частка плошчы пад аўсом была засеяна без папярэдняга баранаваньня ўзаралай плошчы. Бульбу на многіх вучастках садзілі без гною, на дрэнна апрацаванай глебе. З 5.041 тоны ўгнаеньняў на палі вывезена толькі 2.041.

Арганізацыю працы характарызуюць наступныя показальнікі. Брыгады ня маюць рабочых плянаў і фактычна не замацаваны за пэўнымі вучасткамі. Сёньня рабочы занят на адной рабоце, заўтра на другой. Няма цікавага ўліку працы. Нормы і зьдзельнічына існуюць толькі на паперы. За конюхамі коні не замацаваны. Конскі парк у вельмі дрэнным становішчы і ўпэўнена заяўляе: «У бліжэйшыя дні скончым сяўбу».

Такіх чынам дзьве гадзіны працуюць на сьнеданьне!

Вось яшчэ адзін з пунктаў правіл: «За спазьненьне без уважлівых прычын да 10 мінут налічваецца адна гадзіна прагулу, за другое спазьненьне—дзьве гадзіны, за трэцяе—пяць гадзін і г. д.».

Меры ўзьдзейнасьці прымяняюцца толькі пасьля таго, як гультай спозьніцца на работу ня менш 4 разоў.

Кіраўніцтва прыгарадпай гаспадаркай не паклапаціцца правільна расставіць рабочую сілу.

Узорам мітусьні і выключна дрэннай арганізацыі працы можа служыць дзень 14 мая. Частка брыгады зранку была на міраванна на пасадку бульбы. Да месца работы на працягу 6 гадзін падвозілі на соньне. Пасьля абеду загадчык вучастку Круцікаў перакінуў усіх рабочых на вывазку гною. Падвезеную да месца пасадкі бульбу прышлося вазіць назад у пуню. На гэтай бесплённай рабоце цэлы дзень былі заняты 3 работнікі і 2 коні.

Трактары скарыстоўваюцца няправільна. Напрыклад, трактар «ФП» магутнасьцю 10 сіл развозіць на полі гной, ён цягне калёсы, у якіх звычайна запрагаюць двух коняй. А тым трактары, што працуюць на ворыве, па некалькі разоў у дзень за 1,5 клм. прыяжджаюць на сядзібу для заправкі. У выніку нормы ня выконваюцца. Трактар «Інтар» за зьмену ўзорвае толькі 2,5 га.

Вось дзе прычыны нездавальняючых тэмпаў сяўбы ў каапгасе Бабруйскага ЦРК.

П. Ч.

ЧАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭЗАЛЮЦЫЯ, ... самадзей.

каапгасе, даволі для таго, каб зрабіць вывады:

Каапгас «Новы сьвет» зрывае арыентовачныя заданьні па сабекошту прадукцыі. Хаатычнае скарыстаньне рабочай сілы і напляваецельскія адносіны да каня вядуць да далейшага падаражэньня палявых работ.

Уся справа тлумачыцца **адсутнасьцю гаспадарчага разрахунку.** Завод адпускае каапгасу грошы, не ўваходзячы ў сутнасьць зробленых затрат, не кантраляючы правільнасьці расходаваньня сродкаў. Таксама каапэрацыя, у асобе Белкаапсаюзу, амаль ня цікавіцца гэтым пытаньнем.

Зусім відавочна, што і кантроль рублём, які ўказваецца банкам у адносінах каапгасаў, не дае патрэбнага эфэкту. Банк не ўваходзіць у сутнасьць пытаньня. Характэрны прыклад: для таго, каб атрымаць грошы на другую дзесяцідзённку мая, каапгас даў банку весткі аб затратах на сяўбу аўса. Колькі-ж гаспадарка павінна была расходаваць сродкаў на выпрацоўваньне аўса — аб гэтым банк ня ведае.

Такім чынам фактычна няма таго фінансавага прэсу, які-б прымушаў кіраўніцтва каапгасу змагацца за зьніжэньне сабекошту. Банк б'е міма цэлі, бо, як паказвае практыка «Новага сьвету», фармальныя патрабаваньні банку можна лёгка абыйсьці.

Каапгас «Новы сьвет» не зьяўляецца выключэньнем у галіне перавышэньня норм выдаткаў. Характэрна, што ні адна прыгарадная гаспадарка не перадала Белкаапсаюзу сваіх показальнікаў па плянавым сабекошце прадукцыі і падрабязных калькуляцый

Саўгасы, па прыкладу перадавых у сацспаборніцтве з Заходняй вобласьцю, дабецеся пасьпяховага завяршэньня сяўбы

Прымайце выклік, адкажэце справай ДА УСІХ ДЫРЭКТАРОЎ САЎГАСАЎ БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Нашы саўгасы—Горкі-Абчак, «Камсамолец», Луцаўшчына, імя Дзяржынскага, «Беларусь» і Кухцічы скончылі сяўбу яравых, у тэрмін выканаўшы за даньне партыі і ўраду.

Сваячасовая сяўба, правільная апрацоўка глебы, поўнае выкарыстаньне ўтнаеньняў і правядзеньне ўсіх аграправіл даюць нам права заявіць, што з нашых саўгасных палёў мы зьбярэм высокі ўраджай.

Ленінскае сацыялістычнае спаборніцтва—вось тое асноўнае зьвяно, уха піўшыся за якое мы дасягнулі перамогі на пасеўным фронце. Практычнай праграмай для нас зьявіўся вопыт **ФЕАДАСІЙСКАГА** збожжасаўгасу, які першым з усіх саўгасаў СССР скончыў веснавую сяўбу.

Уся наша работа праходзіла і праходзіць пад лёзунгам сацыялістычнага спаборніцтва з Заходняй вобласьцю за тэмпы, за якасьць пасеўнай.

Мы ўпэўнены, што і ў вас, таварышы, ёсьць поўная магчымасьць неадкладна, у бліжэйшыя 2-3 дні цалкам і добра засеяць усе яравыя.

Арганізуйце, узначальце сацыялістычнае спаборніцтва! Не павінна быць ні аднаго рабочага, спэцыяліста, ні аднаго агрэгату, брыгады, пэху, фэрмы, аддзяленьня, якія-б ня прымалі сапраўднага ўдзелу ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю за сваячасовае правядзеньне сяўбы.

Дырэктары саўгасаў Аршанскага і Віцебскага трэсту, да вас асобны раз. Вы, апынуўшыся на чорнай дошцы, усклалі гэтым самым ганебную пляму на ўсю сыстэму. Даволі цягнуцца ў хвасьце! Пераключайцеся на ўдарныя тэмпы, мабілізуйце ўсе свае сілы і на аснове сацыялістычнага спаборніцтва дабецеся неадкладнага выкананьня плянаў сяўбы яравых.

Мы са свайго боку абяцаем суседнім адстаючым саўгасам сацыялістычную ўзаемадапамогу.

Разам з тым мы даем слова разгарнуць далейшую барацьбу за тое, каб ні адзін кілёграм зерня, засеянага на палёх нашых саўгасаў, не загінуў ад пустазельля, с.-г. шкоднікаў і ад страт пры ўборцы.

Па-ўдарнаму пераключаемся на прапалачную работу і падрыхтоўку да ўборкі.

Выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне прапалачных і ўборачных работ усіх дырэктароў і палітаддзелы саўгасаў БССР.

Дырэктар саўгасу Горкі-Абчак МАНДРУКЕВІЧ.
Дырэктар саўгасу Луцаўшчына КАСЬКО.
Дырэктар саўгасу «Камсамолец» ПУКШАНСКІ.
Дырэктар саўгасу імя Дзяржынскага КУРЛОВІЧ.
Дырэктар саўгасу Кухцічы ВІЛЕЙКО.
Дырэктар саўгасу «Беларусь» ЛІНЬКЕВІЧ.

Наркамзем БССР тав. БЭНЭК—ударкікам сяўбы

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА.
РК КП(б)Б — КРАЦЭРУ
РВК — ЎТКІНУ
Райзямаддзел — КАВАЛЬЧУКУ.

Віншую з перамогай усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сярэднякоў, якія першымі ў БССР закончылі сяўбу.

Жадаю такіх-жа посьпехаў у правядзеньні іншых сельска-гаспадарчых работ—падняцьці папароў, поліве, уборцы. Дабецеся высокага ўраджаю.

БЭНЭК.

ЛЮБАНЬ

Саўгасу «Дзесяцігодзьдзе БССР»

Віншую рабочых-ударнікаў, адміністрацыю і агратэхнічны пэрсанал з датэрміновым скапчэньнем сяўбы капапель—асноўнай культуры саўгасу. Разгортвайце барацьбу за хутчэйшае скапчэньне сяўбы іншых культур, за стварэньне харчовай базы для рабочых саўгасу, за высокі ўраджай.

БЭНЭК.

У АВАНГАРДЗЕ СЯЎБЫ

СТАРЫЯ ДАРОГІ, 22.

Саўгас Палажэвічы, Менскага малпраптрэсту 21 мая скончыў веснавую сяўбу. Засеяна 283 га—100 проц. плану. Засеяна таксама 8,6 га грамадзкага гароду.

Сяўба праведзена выключна пратручаным насеньнем пры поўным выкарыстаньні ўтнаеньняў.

Разгортваецца праполка.

* * *

ВЕТКА, 21.

Саўгас Ачэса-Рудня Пасентрэсту да 20 мая поўнасьцю засеяў яравыя.

План перавыкананы. Засеяна 327,2 га пры заданьні ў 267,5.

Усе збожжавыя засеяны да 10 мая. Палі былі сваячасова ўгноены. Сяўба праведзена выключна радковым спосабам і пратручаным насеньнем.

Палі саўгасу пакрыліся зялёнымі ўсходамі. Густыя і роўныя, без прасеваў, яны красамоўна сьведчаць аб высокай якасьці сяўбы.

Саўгас пераключыўся на падрыхтоўку да прапалачна-ўборачных работ. У суседні адстаючы саўгас Неглюбка накіравана брыгада з 8 рабочых, 2 трактары, 2 сявяркі і 10 коняй.

* * *

ДЗЯРЖЫНСК, 22.

Да 20 мая саўгас Фанпіаль засеяў усе яравыя культуры. План па ўсіх культурах выкананы, а на аўсе перавыкананы на 2 проц.

Саўгас пераключыўся на прапашна-прапалачныя работы і аказвае дапамогу свайму падшэфнаму калгасу імя Пакроўскага.

ПАСЯБРАВАЛІ З... ЧОРНАЙ ДОШКАЙ

Рашуча ўзмацніць кіраўніцтва аршанскага сьвінаводтрэста

Аршанскі сьвінаводтрэст за ганебныя тэмпы сяўбы занесен на чорную дошку. Гэта нічому **НЕ НАВУЧЫЛА** кіраўніцтва трэсту (дырэктар **АСКЕРКА**).

За апошнюю пяцідзёўку—з 15 на 20 мая—няма ніякага зруху ў сяўбе. Наадварот, тэмпы рэзка **ЗНІЖАНЫ.** Буйнейшы саўгас трэсту—«Перамога», які павінен засеяць 1.500 га яравога кліну, да гэтага часу на сут насьці яшчэ не разгарнуў масавай сяўбы. На 20 мая саўгас «Перамога» засеяў усяго толькі 5 проц. усяго яравога кліну.

Трэст па-ранейшаму па самым апошнім месцы ў сыстэме Наркамсаўгасаў. Да 20 мая плян выкананы толькі на 33,9 проц. 11 саўгасаў трэсту з 37 выканалі свае заданьні на сяўбе яравых усяго на 20 проц.

Кіраўніцтва трэсту ня прымае літаральна ніякіх энэргічных мер. Нматлікія факты прастояў трактарнага парку, нікуды ня вартай арганізацыі працы ў саўгасах, злачынных адносін да каня, нізкай якасьці сяўбы і г. д. застаюцца бяз усякага дзей спага рэагаваньня.

У саўгасе «Перамога» на палёх працуе толькі палова трактарнага парку. 5 трактараў з 10, якія ёсьць у саўгасе, стаяць. Але нават і тыя трактары, якія працуюць па полі, нагружаны зусім невыстарчальна. Якасьць апрацоўкі глебы, як правіла, нізкая: агрэхі амаль у кожнай баразне.

Са злачынным сабатажам аграправіл не вядзецца рашучай барацьбы. У саўгасе Бабінічы 50 проц. насеваў аўса засеяны ў адпавор. Такое-ж становішча і ў саўгасах Прывольле, Пісараўшчына, «Граніт», Варонічы і г. д.

Радковая сяўба ігнаруецца. Сявяркі стаяць, а сяўба праводзіцца ўроскід. У саўгасе Ульяшаўка стаяць 4 радковыя сявяркі. Усе яны наспраўныя. Нядаўна атрыманая 24-радковая трактарная сявярка таксама стаіць. Дырэкцыя саўгасу літаральна нічога не зрабіла, каб адрамантаваць сявяркі. Усё засяваецца ручным спосабам. На палі вывезена толькі 40 проц. гною.

Адной з асноўных прычын ганебнейшага адставаньня саўгасаў трэсту зьяўляюцца зусім нездавальняючая арганізацыя працы і дрэнны догляд коняй.

Характэрнай ілюстрацыяй зьяўляецца саўгас Халоўе. Даволі ўказаць, што ў гэтым саўгасе толькі... з 15 мая ўзяліся за арганізацыю паляводчых брыгад. У тым-жа самым саўгасе толькі цяпер здагадаліся ўста навіць дакладны рэгляамант адпачынку коняй.

Саўгасы трэсту апынуліся на самым апошнім месцы з першых-жа дзён пачатку веснавой сяўбы. Нават і факт заняцьця трэсту на чорную дошку не паслужыў урокам для яго кіраўнікоў. Канкрэтнае, энэргічнае кіраўніцтва сяўбой, канкрэтная дапамога саўгасам падменена пісанінай. Вывады напрошваюцца самі: кіраўніцтва трэсту не спраўляецца са сваімі задачамі.

Патрэбны самыя энэргічныя і рашучыя меры. Саўгасы Аршанскага сьвінаводтрэсту абавязаны ў бліжэйшыя дні ня толькі пакончыць са сваім ганебнейшым адставаньнем, але і дабіцца поўнага выкананьня плянаў веснавой сяўбы.

СЛУЧЧЫНА І ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА РАЗГОРТВАЮЦЬ ПРАПОЛКУ

СЛУЦАК, 21. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

КАЛГАСЫ **СЛУЧЧЫНЫ** ДАТЭРМІНОВА ЗАСЕЯЎШЫ, ЯРАВЫЯ, ЭНЭРГІЧНА РАЗГОРТВАЮЦЬ МАСАВЫЯ ПРАПАШНА-ПРАПОЛАЧНЫЯ РАБОТЫ. ПАЧАЛОСЯ БАРАНАВАНЬНЕ БУЛЬБЫ.

АДНЫМ З ПЕРШЫХ РАЗГАРНУЎ МАСАВУЮ ПРАПОЛКУ КАЛГАС «ПЕРШЫ МАЙ». 20 МАЯ КАЛГАС «РЭВАЮЦЫЯ» ПРАПАЛОЎ 4 ГА ПШАНІЦЫ І 1,7 ГЭКТАРА ГАРОДНІНЫ. КАЛГАС ЯГОРАВА ЗАБАРАНАВАЎ 8 ГА БУЛЬБЫ.

Ч.

* * *

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА, 21. (ПА ТЭЛЕГРАФУ АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

ПЛЯН СЯЎБЫ ПА ЎСІХ СЭКТАРОХ—САЎГАСАХ, КАЛГАСАХ І АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ—ВЫКАНАН. ЗАСЕЯНА 15.917 ГЭКТАРАЎ (ПЛЯН НАВАЕ ЗАДАНЬНЕ—15.800 ГА). ПЛЯНЫ СЯЎБЫ ПА АЎСУ, ІЛЬНУ, БУЛЬБЕ І КАНОПЛЯХ ПЕРАВЫКАНАН. БУЛЬБЫ ЗАСЕЯНА 5.500 ГА—110 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

У ПЕРШЫХ РАДОХ ПА ТЭМПАХ І ЯКАСЬЦІ СЯЎБЫ ІДУЦЬ МАКРАНСКІ, СТАРЧЫЦКІ І БЯЛЕВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТЫ.

ВЯЛІКУЮ РОЛЮ Ў СВАЯЧАСОВЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЯЎБЫ АДЫГРАЛІ БРЫГАДНЫЯ ПАЛЯВЫЯ НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ. ЗА ЧАС МАСАВАЙ СЯЎБЫ ВЫШЛА 920 НУМАРОЎ.

З ПОСЬПЕХАМ ВЫКАНАЎШЫ ПЛЯН СЯЎБЫ ЯРАВЫХ, РАЁН ПЕРАКЛЮЧЫЎСЯ НА ПРАПАШНА-ПРАПОЛАЧНЫЯ РАБОТЫ І ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ.

РАЗГОРТВАЕЦЦА МАСАВАЕ БАРАНАВАНЬНЕ БУЛЬБЫ.

КАЛГАС «БАЛЬШАВІК» ПРЫСТУПІЎ ДА ПРАПОЛКІ ПШАНІЦЫ. 22 МАЯ — СПЭЦЫЯЛЬНАЯ НАРАДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ ПА ПЫТАНЬНЯХ ЛЕПШАГА І ХУТЧЭЙШАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПРАПАШНА-ЎБОРАЧНЫХ РАБОТ.

25 МАЯ АДБУДЗЕЦЦА РАЁННЫ ЗЬЛЕТ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

С.

КАМСАМОЛЬСКІ ПЯЦІДЗЕНЬНІК СЯЎБЫ

Сёньня пачынаецца ўсебеларускі ўдарны камсамольскі пяцідзеньнік сяўбы. Задача ўсіх райкомаў ЛКСМБ, усіх калектываў і ячэек, усіх камсамольцаў пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый дабіцца завяршэньня веснавой сяўбы на ўсіх культурах да 25 мая.

ЦК ЛКСМБ лічыць 15 мая даў канкрэтнае заданьне кожнаму члену ЛКСМБ, кожнай камсамольскай ячэйцы, кожнаму райкому ЛКСМБ. ЦК указаў, што і як трэба рабіць, як правесьці пяцідзеньнік, каб дабіцца перамогі, каб выпрыкмаць гэты баявы экзамэн.

Райкомы КП(б)Б, партыйныя ячэйкі абавязаны ўзначаліць камсамольскі пяцідзеньнік сяўбы, скарыстаць гэты пяцідзеньнік для шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва з Зах. вобласьцю.

16 мая пастанова ЦК ЛКСМБ аб абвяшчэньні пяцідзеньніка была надрукавана ў «Зьвязьдзе» і «Чырвонай зьмене». У гэты-ж дзень пастанова была перадана па тэлеграфу ва ўсе раёны БССР. Адсюль зусім ясна, што райкомы ЛКСМБ ужо 17 мая мелі магчымасьць і павінны былі разгарнуць канкрэтную работу.

У рэдзе раёнаў так і зрабілі (Слуцак, Жыткавічы, Рагачоў, Чырвоная Слабада, Слонім).

Але далёка ня ўсюды. У Талачынскім, Мсьціслаўскім, Гарадоцкім, Аршанскім, Віцебскім, Сурасскім, Лепельскім і іншых раёнах практычную справу падмяняюць «засядацельскай» мітусьнёй. Скліканьць бясконцыя пасяджэньні, вылучаюць упадпаважаных, а работы ня відаць.

Адстае і Менская арганізацыя. Дні — 16, 17, 18 і 19 мая — пазначаны па гаварыльню, на розныя нарады і г. д. 12 работнікаў гарэкому ЛКСМБ і па сёньнішні дзень ня выехалі на вёску.

Райкомы КП(б)Б, камсамольскія арганізацыі павінны на справе, па-баявому правесьці ўдарны камсамольскі пяцідзеньнік, каб да 25 мая ва што-б там ні стала завяршыць веснавую сяўбу, каб пярэдняцтва ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю заставала БССР.

В. С.

ЦК КП(б)Б тав. Гікало, Наркамзему, Збожжатрактарацэнтру, газэце „Зьвязда“

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, пры штодзённым кіраўніцтве Тураўскага РК КП(б)Б, Тураўская МТС кончыла сяўбу яравых. Збожжавых засеяна 1.415 га—108,5 проц., прапашных 695 га—100 проц., тэхнічных 211 га—100 проц.

Кончыўшы сяўбу, МТС пераключылася на прапашна-прапалачныя работы і дапамогу калгасам, якія не абслугоўваюцца МТС.

Сакратар ячэйкі ЯРУЖЭНЕЦ.
Дырэктар МТС СІЛЬЯНАЎ.
Старшы аграном ЯРМАШЭНКА.

Адкрылася сэсія Акадэміі Навук Беларусі

22 мая днём з удзелам украінскіх вучоных адкрылася чарговая сэсія Беларускай Акадэміі Навук.

Сэсію вітаў прадстаўнік усесаюзнай Камакадэміі тав. ЗІМІН, які адзначыў, што камакадэмія з вялікай цікавасьцю сочыць за разгортваньнем навуковай работы ў Савецкай Беларусі. У часе дэкадніка беларускіх вучоных у Маскве імі быў прадэманстрован рад буйных дасягненьняў на навуковым і тэарытычным фронце.

Віцэ-прэзыдэнт УАН акадэмік тав. А. В. ПАЛАДЗІН.

— Мы,—кажа тав. ЗІМІН,—імкнемся да таго, каб наладзіць шчыльную ўзаемную сувязь паміж Масквой і Менскам, паміж Камакадэміяй і Беларускай Акадэміяй Навук.



Акадэмік тав. Я. А. ПАТОН.

Дэлегацыя падшэфнага Акадэміі калгасу «СЛАБАДА», САМАХВАЛАВІЦКА ГА СЕЛЬСАВЕТУ, РАПАРТАВАЛА АБ ДАТЭРМІНОВЫМ СКАНЧЭНЬНІ СЯЎБЫ РАНЬНІХ КУЛЬТУР. Шэф—Акадэмія Навук аказала калгасу актыўную дапамогу ў пасьпяховым выкананьні плану сяўбы. Калгасьніні ў першы-ж дзень апублікаваньня дэкрэту ўраду падпісаліся на «пазыку другой пяцігодкі» на 4.605 руб.

З адказным словам выступіў неадменны сакратар Акадэміі акадэмік ПАНКЕВІЧ.

На ранішнім пасяджэньні віцэ-прэзыдэнт БелАН праф. ДОМБАЛЬ зрабіў даклад аб ПРАБЛЕМЕ ВЯЛІКАГА ДНЯПРА.

Тав. Будзённы ў Гомелі

ГОМЕЛЬ, 22. Учора прыбыў член Рэўваенсавету СССР тав. БУДЗЁННЫ, якога сустрэлі на станцыі прадстаўнікі партыйных, савецкіх арганізацый і гарнізону.

Тав. БУДЗЁННЫ наведаў падшэфную яму кавалерыйскую дывізію яго імя.

Увечары ў сувязі з прыездам тав. БУДЗЁННАГА ў парку культуры і адпачынку адбылася палітмасоўка, у якой прымала ўдзел звыш 4.000 пралетараў Гомельшчыны. Выступленьне тав. БУДЗЁННАГА было спаткана бурнай авацыяй. (БЕЛТА).

Украінскія вучоныя ў Менску

19, 20 і 21 мая украінскія вучоныя прачыталі ў інстытутах Беларускай Акадэміі Навук, інстытуце гісторыі прэсы, Унівэрсытэцкім гарадку, Доме тэхнікі 12 навуковых дакладаў.

Прачытаны наступныя даклады: акадэмік **А. А. БАГАМОЛЕЦ**—«Мэханізм рэгуляваньня вуглеводнага абмену», акадэмік **А. В. ФАМІН**—«Задачы і пэрспэктывы навуковай працы ў галіне батанікі ў Беларусі», акадэмік **А. В. ПАЛАДЗІН**—«Дасьледваньне па хэмічнай дынаміцы мускулаў», акадэмік **А. Г. ГОЛЬДМАН**—«Праблема ператварэньня энэргіі сьвятла ў электрычную», прафэсар **П. Д. ФІЛІПОВІЧ**—«Вынікі навуковай работы ў галіне літаратуразнаўства на Украіне», прафэсар **С. С. КАКОШКА**—«Барацьба за Кастрычнік на Украіне», акадэмік **А. А. БАГАМОЛЕЦ**—«Пераліваньне крыві», акадэмік **А. В. ФАМІН**—«Дасягненьні ў галіне батанікі ў БССР», прафэсар **М. М. КАМЫШАН**—«Маркс і яго эпоха», акадэмік **С. Ю. СЕМКОЎСКІ**—«Марксызм і прыродазнаўства», прафэсар **ШАБЛІОЎСКІ**—«Асноўныя праблемы марксаленінскага пэўчэнказнаўства», акадэмік **Е. О. ПАТОН**—«Навукова-дасьледчая работа ў галіне электразварэкі ў 2-й пяцігодцы».

Даклады прайшлі пры перапоўненых аўдыторыях і выклікалі ажыўленыя спрэчкі, у якіх прымалі ўдзел акадэмікі, навуковыя работнікі БелАН, інжынэры, тэхнікі, рабочы актыў.

* * *

Ад імя прэзыдэнта Усеўкраінскай Акадэміі Навук акадэміка **Багамольца** і прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук акадэміка **Горына** паслана тэлеграма майскай сэсіі Усесаюзнай Акадэміі Навук, якая адкрылася ў Ленінградзе.

У тэлеграме адзначаецца, што ў сувязі з прыездам групы украінскіх вучоных у Менск, распрацаваны рад практычных мерапрыемстваў па ўзмацненьні адзінства савецкай навукі і выказваецца ўпэўненасьць, што майская сэсія Усесаюзнай Акадэміі Навук таксама зьявіцца далейшым крокам у справе ўзмацненьня адзінства сацыялістычнай навукі і больш цеснай сувязі навукі з сацыялістычным будаўніцтвам.

Акадэмік тав. А. В. ФАМІН

Сёньня, 23 мая 1933 г., у 5 гадзін вечара, у **Інстытуце эканоміі БАН** (сэкцыя эканамічнай-геаграфіі) адбудзецца

ДАКЛАД прадстаўніка Камакадэміі тав. **ЗІМІНА** на тэму:

„Асноўныя праблемы эканамічнай геаграфіі капіталістычнага сьвету“.

На даклад запрашаюцца—эканамісты і ўсе працаўнікі ў галіне эканамічнай геаграфіі, а таксама студэнцтва.

Дырэкцыя інстытуту эканоміі.

Сёньня 23 мая

У памяшканьні Беларускага Мэдыцынскага Інстытуту (Унівэрсытэцкі Гарадок, Анатамічны корпус, 3-ці паверх) адбудзецца ДАКЛАД ВІЦЭ-ПРЭЗЫДЭНТА ЎСЕЎКРАІНСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК акадэміка А. В. ПАЛАДЗІНА.

«САВЕЦКІ МЭДЫЦЫНСКІ ТЫДЗЕНЬ У ГЕРМАНІІ»

Пачатак роўна а 6 гадзіне.
УВАХОД ВОЛЬНЫ.

ПАПРАЎКА

У мэтах выпраўленьня дапушчаных пры перадачы па тэлефону з Самары ў Маскву скажэньняў у прамове тав. Молатава (гл. «Зьвязду» ад 18 мая) перадрукоўваем у выпраўленым відзе адпаведныя месцы прамовы, у якіх дапушчаны гэтыя скажэньні:

Калёнка першая:

«І нам асабліва важна падкрэсьліць, што мы зараз выпраўляем наш пасеўны фронт (было надрукавана: пасеўны плян) па гэтым лепшым годзе».

Калёнка другая:

«Настоўкі вялікі пералом у адносінах да калгасаў нават у тэй частцы сялянства, якая доўга хісталася і значна адставала па калектывізацыі (было надрукавана: ад калектывізацыі)».

Канец калёнкі першай:

«Мы будзем ужо ня першы год нашы калгасы, але мы яшчэ не маглі (было надрукавана: мы яшчэ ня можам) бачыць усіх тых рэзультатаў, якія нашы ны даць і дадуць нашы калгасы».

«Мы ўкладзілі шмат сіл і сродкаў у будаўніцтва нашых заводаў. Але яшчэ не можам) да гэтага часу адчуць у поўнай мэры, якую ажыцьцяўляе прадукцыю яны нам могуць даць».

А цяпер прыходзіць час калі мы ўсе вымо жам (было надрукавана: калі мы ўсе маглі) пачуваць перакананцца, якую сілу мы атрымалі ў нашы рукі ў гэтых заводах».

Калёнка чацьвертая:

«У сельскай гаспадарцы вялікамі панавалі дробны гаспадар і памешчык, які эксплёатаваў сялянства (было надрукавана: дробны гаспадар і памешчык, якія эксплёатавалі сялян)».

«Тав. Сталін на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў гаварыў: што калгасы за першыя гады (было надрукавана: за першы год) свайго існаваньня падняй бадняду да ўзроўню серадняцкай. Бедняцка на справе ўбачыла ўсе перавагі калгаснага ладу, палепшэньня свайго становішча. У меншай мэры гэта магло пакуль датычыць (было надрукавана: гэта можа пакуль датычыць) серадняцкіх мас».

«... цяпер наступае такі пэрыяд, калі рэзультаты калгаснай працы будуць адчуваць усё больш і больш непасрэдна і былымі беднякамі і былымі серадняцкамі (было надрукавана: і былымі серадняцкамі і былымі беднякамі)».

«Кулацкія элементы, расхіданыя па ўсёй тэрыторыі краіны, шпіны раз опрытна пралазілі (было надрукавана: ня раз спрытна пралазілі) туды, куды яны хацелі...»

Шосты абзац пачатку прамовы **па віне друкарні** пры вёрстцы пераблытан, што скажае сэнс. Гэты абзац трэба чытаць так: «Што датычыць Сярэдняй Волгі, то яна, як і Татарыя, ужо ня з тэтай пяцідзёўкі, а значна раней і ідзе значна лепш ня толькі мінулага году, але і 1930 году. І таму я з асаблівым задавальненьнем вітаю зьезд калгасьнікаў-ударнікаў Сярэдняй Волгі: ды больш чым на 1 мільён га апярэдзілі ўзровень 1930 году» і г. д.

У 7 абзацы 18 радок: «Раённыя краявыя органы па чале...» павінен быць пастаўлен пасьля 18 радка: «калгаснай дысцыпліны, дзе сельскія» і г. д.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ Т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ
(Менск, Першамайская вул., дом № 7)

ШУКАЕ наступных грамадзян, якім належыць з Амэрыкі страхоўка, пэнсія і інш. віды ўзнагароды пасьля памёршых там іх радных.

АДШУКВАЮЦЦА:

Капіноўскі Віктар.
Кленіцкі Васіль.
Піневі Соф'я.
Зарэцкая Гольда.
Філіпчэнка Якаў.
Цыпінава Зыгмунда.
Качан Іван, Лявон, Мікалай Навумавы.
Сыгмон, Майсей, Мікалай, Андрэй, Тарас.
Родзічы Запеўскага Івана.
Камінковіч Сара і Савуп—бацькі Самуіла Красава.
Платун Міхаіл — бацька Платун (Платоні) Івана.
Зайкоўскія Андрэй і Стэфана—бацькі Зайкоўскага Стэнлі.
Тамаш і Ева Каск—бацькі Каска Франка.
Бацькі Янсэвіча Ёсіфа.
Родзічы Стронгіна Самуіла.
Осіпаў Ціхан.
Родзічы Пануркова Цімафея.
Родзічы Грабавацкага Хведара.
Ёсіф і Рэвека Чарткевы—бацькі Чарткова Майсея, Брадоўскі Казімір.
Маці Герасімненка Пятра.
Родзічы Саўчука Арона.
Гапэўчынэр Бэла—сястра Гапаўчынэра Абрама.
Купава Надзя—сястра Купава Трахіма.
Сястра Вяліцкага Якава.
Родзічы Шаўчука Якава.
Могар-Джым—брат Могара Ёсіфа.
Родзічы Тэтэльбаўма Тэрмі.
Саўчук Якаў—бацька Саўчука Сёма.
Родзічы Коген Гары.
Ізідар і Цыля Уліцкія—бацькі Уліцкага Макса.
Родзічы Собель Франка.
Родзічы Рэчэса Антонія.

УВАГА: Трэба ведаць, што прозьвішчы з Амэрыкі часта даюцца пераблытанымі пры перакладзе з ангельскай мовы на расійскую.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Касы—ад 1 г. дня. Новая мастацкі фільм **5 НЯВЕСТ**

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. 2-ая сорыя 2-ая амэрыканскага прыгодніцкага фільму **ШПАРКІ**

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ Мастацкі фільм **НЯМЫ ВАРЫЯНТ** Пуцёўка ў жыцьцё драма ў 34 эпізодах

„СПАРТАК“ Каса адкрыта з 3 г. 30 м. Мастацкі фільм **ХРАМЫ БАРЫН** драма ў 7 частк.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР імя 8-га сакавіка. Дзіцячыя сэансы **Шынэль** Гогаля у 7 част. Вячэрнія сэансы гукавы фільм **„Інтэрнацыянал“** у 2-х ч. **„Шынэль“** Гогаля у 7 ч. Каса з 1 г. дня

МЕНСКІ ЛЯСНЫ СКЛАД БКС
ШЫРСПАЖЫВУ
(вул. Карла Лібкнэхта, каля базы Белдзяржснабу № 2) даводзіць да ведама, што на складзе
ЁСЬЦЬ ВЯЛІКІ ВЫБАР
ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ,
дуг, колы і інш.
Склад адкрыт з 8 г. раніцы да 5 г. вечара

Нарсуд 2 вуч. г. Менску, згодна прыгавору ад 29-IV—33 г., абвяшчае **грамадзянае ганьбаваньне гр-ну Астапенка Пятру Афанасьсеву**— ст. Міхаілавічы па справе па абвінавачаньні яго па 196 арт. КК

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ
Народным Камісарыятам Фінансаў БССР
восьмага мая 1933 г. на падставе арт. 2-4 палаж. аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II. 1931 г. (збор. закон. і загад. СССР № 8, паст. 99) **зарэгістраваны** у рэестры юрыдычных асоб за № СТО СОРАК ЧАЦЬВЕРТЫМ статут
Беларускага Каапэрацыйна-Прамысловага Саюзу харчовай каапэрацыі
„БЕЛХАРЧПРАМСАЮЗ“
Саюз уваходзіць у сыстэму Белкаапрамсавету.
Адрас саюзу: г. Менск, Інтэрнацыянальная, 9.
Разьліковы рахунак у Бел. К-ры Дзяржбанку № 105-4240.

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ.
НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР
восьмага мая 1933 г. на падставе арт. 2-4 палаж. аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II—31 г. (збор. закон. і загад СССР № 8, паст. 99)
ЗАРЭГІСТРАВАНЫ
у рэестры юрыдычных асоб за № сто сорак трэцім статут
БЕЛАРУСКАГА САЮЗУ МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧЫХ АРЦЕЛЯЙ ПРАМЫСЛОВАЙ КААПЭРАЦЫІ
„БЕЛМЭТАЛЯПРАМСАЮЗ“.
Саюз уваходзіць у сыстэму Белкаапрамсавету.
АДРАС САЮЗУ: г. Менск, Інтэрнацыянальная, 9.
Разьліковы рахунак у Бел. К-ры Дзяржбанку № 105-4204.

Усім ГарКК і РКК-РСІ

Ход загатоўкі кары за першыя дзьве дэкады мая зусім нездавальняючы. Прапаную ўсім ГарКК і РКК-РСІ ўзяць пад кантроль выкананьне плянаў па кары загатоўчымі арганізацыямі, шляхам заслухоўваньня апошніх і прыцягваючы вінаватых у зрыве плянаў да адказнасьці.

Нам. наркома РСІ АВЕРЫН.

Тэлефоны рэдакцыі „ЗЬВЯЗДА“ Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культурнага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага будаўніцтва і снаб жэньня каапэрацыі і мас. каап.—21-350; транспартны сэктар і бюро расьсьледваньня—21-355; машыннае бюро—21-351; загадчык выдавецтва і аддзел абвестак—21-358; вучотна-тыражны сэктар—21-360; кантора выдавецтва—21-885; друкарня—21-357.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.